бел. літаратуры. З 1960-х гадоў выступала Г.Рыжкова, аснову рэпертуару якой склалі сатырычныя вершы, байкі, апавяданні. У 1960—70-я гады ў Белдзяржфілармоніі, на эстрадзе працавалі чытальнікі Зорын, Г.Бандарэўскі, Маркалёва, Р.Пятрэнка, С.Сакалоў, Спіткоўская, З.Сысоева, рэпертуар якіх быў вельмі бедны на бел. мастацкае слова. З 1972 з літ. канцэртамі выступае Казінін, прапагандуе сусв. мастацкую л-ру. М.ч. развіваецца і ў аматарскай творчасці. Адбыліся рэсп. конкурсы чытальнікаў, прысвечаныя 50- і 60-годдзю ўтварэння БССР і КПБ (1969, 1979), 100-годдзю з дня нараджэння У.І.Леніна (1970), 90-, 100- і 110-годдзю з дня нараджэння нар. песняроў Беларусі Я.Купалы і Я.Коласа (1972, 1982, 1992), 1-ы Рэсп. конкурс тэатраў чытальнікаў, тэатраў паэзіі, калектываў маст. чытання. Удзельнічалі бел. аматары М.ч. і ў 1-м Усесаюзным фестывалі самадзейнай маст. творчасці, прысвечаным 40-годдзю Перамогі ў Вял. Айч. вайне (1983—85). Існуюць 2 нар. калектывы чытальнікаў: *Мінскі народны літаратуры тэатр «Жывое слова»* Бел. пед. ун-та імя М.Танка (з 1966) і тэатр. паэзіі «Звон» Бел. тэхнал. ун-та (з 1969). У 1989 пры Бел. філармоніі адкрыты *Беларускі паэтычны тэатр аднаго акцёра «Зьніч»*, стваральнік і маст. кіраўнік якога актрыса Г.Дзягілева. З 1990 пачалася падрыхтоўка прафес. чытальнікаў на тэатр. факультэце Бел. АМ, адкрыта спецыялізацыя «Акцёр драмтэатра, кіно і чытальнік». Шмат увагі аддаецца выпрацоўцы навыкаў М.ч. і пры падрыхтоўцы будучых акцёраў і рэжысёраў.

*А.А.Каляда.*

**МАСТА́ЦКІ КІРАЎНІ́К**, спецыяліст, які ўзначальвае працу ўсяго калектыву, адказвае за яго работу, вызначае кірункі дзейнасці тэатра, займаецца адборам рэпертуару, кантралюе рэпетыцыйны працэс і графікі выпуску спектакляў. Можа сумяшчаць абавязкі *рэжысёра*. М.к. у тэатр. педагогіцы — рэжысёр-педагог, які адказвае за ўвесь навуч.-творчы працэс, яго выхаваўчы і эстэт. бакі, займаецца адборам рэпертуару для вучэбных пастановак, каардынуе работу педагогаў курса па спецыяльнасці, займаецца і пастаноўкамі спектакляў.

*І.А.Алексніна.*

**«МАСТА́ЦТВА»**, штомесячны грамадска-палітычны і навукова-папулярны ілюстраваны часопіс па пытаннях мастацтва. Выдаецца з 1983 у Мінску, да 1991 наз. «Мастацтва Беларусі». Гал. рэдактары М.Раманюк, Я.Сахута (з 1985), А.Дудараў (з 1991), В.Салееў (з 2002). Асвятляе праблемы эстэтыкі і тэорыі мастацтва, выяўл. мастацтва, тэатра, кіно і тэлебачання, музыкі, нар. мастацтва. Вядзе хроніку маст. жыцця рэспублікі, публікуе рэцэнзіі на новыя кнігі, у т.л. па тэатры. Аддзел тэатра шмат увагі аддае пытанням сучаснага драм. сцэн. мастацтва Беларусі. Аналізуецца і абмяркоўваецца стан тэатр. мастацтва, задачы і кірункі яго развіцця, рэцэнзуюцца прэм'еры ў тэатрах Беларусі. Змяшчае матэрыялы па праблемах драматургіі, рэжысёрскага і акцёрскага мастацтва, прысвечаныя штогадовым вынікам тэатр. сезонаў, аглядам творчага жыцця вядучых тэатраў Беларусі. Часопіс знаёміць з




Вокладка часопіса ***«Мастацтва»***.

выпускнымі курсамі акцёраў Бел. АМ. У «творчай лабараторыі» наладжвае сустрэчы з выдатнымі дзеячамі сцэны, з маладымі акцёрамі і рэжысёрамі. Асвятляе дзейнасць тэатраў лялек, найб. цікавых сцэнографаў. Шмат месца адводзіць пытанням тэорыі і гісторыі сцэн. мастацтва. Публікуе матэрыялы пра бел. і міжнар. тэатр. фестывалі, пра замежнае тэатр. мастацтва.

Часопіс мае шырокае кола аўтараў. У розныя гады артыкулы па пытаннях тэатр. мастацтва ў ім друкавалі вядучыя бел. крытыкі. Па праблемах рэжысуры і акцёрскага майстэрства выступалі дзеячы бел. сцэны: рэжысёры В.Катавіцкі, В.Маслюк, Л.Манакова, М.Пінігін; акцёры З.Браварская, Л.Давідовіч, Г.Давыдзька, В.Манаеў, А.Міланаў, Н.Піскарова, С.Кузьміна, У.Шэ-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ